Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

**Л. Л. Шкуцько,**
**М. М. Сакалоў**

# ЯЎРЭЙСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ЧАСТКА СІСТЭМЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920–1930-Я ГАДЫ

*Вучэбны дапаможнік*

Мінск 2001

УДК 63.3(2)613(4Беи)
ББК 947.084.63(476)
Ш678

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

*Рэцэнзент У. І. Навіцкі*, доктар гістарычных навук, прафесар

**Шкуцько Л. Л., Сакалоў М. М.**

Ш678 Яўрэйская нацыянальная культура як частка сістэмы народнай асветы на Беларусі ў 1920—1930-я гады: Вучэб. дапам. — БДПУ імя М. Танка, 2001. — 30 с.

У дапаможніку на прыкладзе становішча яўрэйскай нацыянальнай адукацыі раскрываецца распрацоўка і ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920—1930-я гады. На аснове архіўных дадзеных і навуковых публікацый прыведзены звесткі аб існаванні яўрэйскай адукацыі ў сістэме агульнаадукацыйнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі міжнацыянальных адносін і адукацыі на Беларусі.

ББК 947.084.63(476)

© Л. Л. Шкуцько, М. М. Сакалоў, 2001
© Вокладка. А. А. Пакала, 2001

# УВОДЗІНЫ

Ва ўмовах поліэтнічных краін, да якіх адносіцца і Рэспубліка Беларусь, праблемы нацыянальнай палітыкі і міжнацыянальных адносін займаюць адно з найважнейшых месцаў. Нацыянальна-этнічныя адносіны ў сучасным свеце належаць да ліку глабальных праблем чалавецтва. Зараз на зямлі налічваецца звыш 2000 народаў, прычым больш за 90% з іх жывуць у шматнацыянальных дзяржавах. Беларусь таксама з'яўляецца поліэтнічнай дзяржавай, бо на яе тэрыторыі здаўна побач з беларусамі пражываюць рускія, украінцы, палякі, яўрэі, татары, немцы, літоўцы, латышы, цыганы і іншыя народы. У такіх умовах істотна ўзрастае важнасць захавання стабільнасці і бесканфліктнасці ва ўзаемаадносінах паміж прадстаўнікамі розных супольнасцей, што магчыма дасягнуць толькі правядзеннем узважанай і разнабаковай нацыянальнай палітыкі з боку дзяржавы.

Вопыт такой палітыкі быў набыты ўжо ў першым дзесяцігоддзі існавання Беларускай савецкай рэспублікі, калі ў 1920-я гг. была распрацавана і пачала ажыццяўляцца палітыка нацыянальнага адраджэння. Палітыка беларусізацыі ўлічвала не толькі наспелыя праблемы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця карэннай беларускай нацыі, якая пераадольвала цяжкую спадчыну паланізацыі і русіфікацыі. Састаўной яе часткай з'яўлялася палітыка задавальнення нацыянальна-культурных і эканамічных патрэб усіх народнасцей, якія складалі насельніцтва беларускага краю.

Такое стаўленне ў поўнай меры праявілася ў 1920-я гг. у дачыненні да яўрэйскай адукацыі, што з'яўлялася важнай сферай духоўнага жыцця прадстаўнікоў гэтай шматлікай этнічнай групы на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым, гісторыя яўрэйскай адукацыі на мяжы 1920-х і 1930-х гг. адлюстравала трагічны лёс нацыянальных культур, стаўленне да іх з боку камуністычных улад у перыяд пабудовы сацыялізму, калі прыярытэт быў аддадзены інтэрнацыяналізму замест збалансаванага спалучэння яго з нацыянальнымі інтарэсамі.

Вывучэнне здабыткаў і дасягненней, цяжкасцей і пралікаў, памылковых падыходаў у ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920—1930-я гг. мае і сёння не толькі навуковы інтарэс, але і практычнае значэнне. Аб гэтым сведчаць шматлікія публікацыі і навуковыя распрацоўкі як па гісторыі самой нацыянальнай палітыкі ў тыя гады, так і па асобных напрамках яе здзяйснення. З 1997 г. выходзіць штоквартальны інфармацыйна-навуковы часопіс "Нацыянальныя меншасці на Беларусі і ў свеце", які выдаецца Міжнароднай Акадэміяй вывучэння нацыянальных меншасцей. Адметнай з'явай стала выданне зборніка навуковых артыкулаў "Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі" пад рэд. А. М. Мацко і М. К. Сакалова (Мінск, 1997), "Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі" пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча (Мінск, 1998). Праблемы нацыянальных узаемаадносін і развіцця асобных нацый на тэрыторыі Беларусі адлюстраваны ў артыкулах і манаграфіях Э. Іофэ, І. Герасімавай, Э. Дубянецкага, Л. Лыча, В. Лукіна, У. Тугая, С. Яцкевіча, І. Канапацкага і іншых навукоўцаў.